Суд у Гомелі адмовіўся разглядаць скаргу „дармаедкі”

таму

Выдрукаваць Пракаментаваць (0) Падзяліцца

Суд Чыгуначнага раёна Гомеля адмовіўся „з прычыны непадведамаснасці” разглядаць скаргу „дармаедкі”. У суд са скаргай на чыноўнікаў з камісіі садзейнічання занятасці насельніцтву адміністрацыі Чыгуначнага раёна звярнулася хатняя гаспадыня **Марыя Тарасенка**. Яна лічыць неправамерным налічваць ёй камунальныя плацяжы па павышаным тарыфе.

Спачатку жыхарка Гомеля безвынікова абскарджвала ў гарвыканкаме дзеянні камісіі, якая ўключыла яе ў спісы не занятых у эканоміцы. Пасля гэтага гамяльчанка пайшла ў суд. Юрыдычную дапамогу ёй аказваў прававы інспектар незалежнага прафсаюза РЭП **Леанід Судаленка**.

У скарзе ў суд было ўказана, што грамадзянка ўдзельнічае ў эканоміцы, бо з’яўляецца спажыўцом тавараў і паслуг, у тым ліку падакцызных, плаціць зборы і пошліны, ускосныя падаткі. Заяўніца лічыць, што члены камісіі ў прыватнасці і дэкрэт „аб дармаедстве” ў цэлым парушаюць Канстытуцыю, права не зведваць прымусовую працу і дыскрымінацыю.

Суддзя Дзмітрый Дзябой адмовіў заяўніцы ў разглядзе справы па сутнасці, хоць менавіта ў суд Марыю Тарасенку адпраўлялі адміністрацыя і гарвыканкам „у выпадку нязгоды з адказам”.

На гэта вызначэнне суда Тарасенка 22 лютага з дапамогай прафсаюза РЭП падала прыватную скаргу ў судовую калегію па грамадзянскіх справах Гомельскага абласнога суда.

„Мы ставім пытанне аб адмове ў правасуддзі, што парушае канстытуцыйныя правы грамадзяніна. Адмовіўшыся разглядаць скаргу, суд парушае Канстытуцыю. Суддзя матываваў сваё рашэнне тым, што правы Тарасенкі не парушаны — маўляў, пакуль яшчэ нічога не выставілі ёй да аплаты, але гэта ж не так. Калі ўнеслі ў гэтую базу, прыйдзецца плаціць павышаную „камуналку”. А на другое патрабаванне скаргі — паставіць перад Канстытуцыйным судом пытанне аб неканстытуцыйнасці дэкрэта — суд наогул не адрэагаваў. Мы выкарыстоўваем усе механізмы ўнутранай абароны, а калі трэба — паставім пытанне перад Камітэтам ААН па правах чалавека, што фактычна ў Беларусі 500 тысячам грамадзян адмоўлена ў правасуддзі, бо гэта тэма тычыцца не толькі Марыі Тарасенкі, а фактычна адной дзясятай часткі эканамічна актыўнага насельніцтва краіны”, — заявіў БелаПАН Судаленка.

Ён заклікаў грамадзян, прызнаных „дармаедамі”, актыўна пісаць скаргі ў суд. „Калі іх будзе некалькі тысяч — як у мінулым годзе некалькі тысяч выйшлі на вуліцы, улада перагледзіць сваё рашэнне”, — лічыць прававы інспектар прафсаюза РЭП.

Для дапамогі „дармаедам” ён падрыхтаваў узоры скаргаў у гарадскія і раённыя выканкамы, а таксама ў суды.

belapan.by (https://by.belapan.by/archive/2019/02/22/994058_994059/)

Facebook (https://www.facebook.com/sharer/sharer.php?u=https%3A%2F%2Fwww.racyja.com%2Fhramadstva%2Fsud-u-gomeli-admoviusya-razglyadats-ska%2F&t=%D0%A1%D1%83%D0%B4+%D1%83+%D0%93%D0%BE%D0%BC%D0%B5%D0%BB%D1%96+%D0%B0%D0%B4%D0%BC%D0%BE%D0%B2%D1%96%D1
Twitter
VKontakte (http://vk.com/share.php?url=https%3A%2F%2Fwww.racyja.com%2Fhramadstva%2Fsud-u-gomeli-admoviusya-razglyadats-ska%2F&image=https://www.ra
content/uploads/2019/02/sud1.jpg&description=%D0%A3+%D1%81%D1%83%D0%B4+%D1%81%D0%B0+%D1%81%D0%BA%D0%B0%D1%80%D0%B3%D0%B0%D0%B
Odnoklassniki (https://connect.ok.ru/offer?url=https%3A%2F%2Fwww.racyja.com%2Fhramadstva%2Fsud-u-gomeli-admoviusya-razglyadats-ska%2F&title=%D0%A1%D1%83%D0%B4+%D1%83+%D0%93%D0%BE%D0%BC%D0%B5%D0%BB%D1%96+%D0%B0%D0%B4%D0%BC%D0%BE%D0%B2%D1%96%
content/uploads/2019/02/sud1.jpg)

Чытайце Таксама
Суд над сынам гомельскіх журналістаў перанесены на 12 жніўня (https://www.racyja.com/hramadstva/sud-nad-synam-gomelskikh-zhurnalistau/)

Уладзімір Няпомняшчых застанецца ў СІЗА да суда (https://www.racyja.com/hramadstva/uladzimir-nyapomnyashchykh-zastanetstsa-u-s/)

У Гомелі затрыманы праваабаронца Леанід Судаленка (https://www.racyja.com/hramadstva/u-gomeli-zatrymany-pravaabarontsa-lea/)

Апеляцыйную скаргу Паліны Шарэнды-Панасюк разгледзяць 8-га чэрвеня (https://www.racyja.com/hramadstva/apelyatsyjnuyu-skargu-paliny-sharendy-pa/)

(/apps/)

Слухайце ONLINE

▶ (/player/online.php)

У эфіры: Навіны

Далей: Прагноз надвор'я

Сетка вяшчання (/radyyo/setka-vyashchannya/)

Перадачы (/radyyo/peradachy/)

Сусветны хіт (/peradachy/susvetny-hit/)

Напішыце нам

Сакратарыят (/kantakt/)

Дашліце нам навіну (/dashlitse-nam-navinu/)

Канцэрт пажаданняў (/peradachy/podlaski-koncert-zyczen/)

Музычны рэдактар (/muzychny-redaktar/)

Рацыя з Алесем Бяляцкім

(https://www.racyja.com/padziei/ratsyya-z-alesem-byalyatskim/)
(https://www.racyja.com/padziei/ratsyya-z-alesem-byalyatskim/)

(https://www.racyja.com/padziei/ratsyya-z-alesem-byalyatskim/)

Сацыяльныя сеткі

Facebook (https://www.facebook.com/racyja)

Twitter (https://twitter.com/Racyja)

Telegram (https://t.me/racyja)

ВКонтакте (http://vk.com/racyja)

Youtube (https://www.youtube.com/channel/UCrqIV7DB9BcS30URvfGAmsg)

Odnoklassniki (https://ok.ru/profile/575784709252)

Каляндар - 15 траўня

Дзень сям'і.

1831	Нарадзіўся Ян Баляслаў Луцкевіч, вайсковец, паўстанец 1863 году, чыгуначнік, бацька Івана і Антона Луцкевічаў.
1845	У фальв. Свольна (Верхнядзьвінскі р-н) нарадзіўся Іван Чэрскі, удзельнік паўстаньня 1863-64, геолаг, географ, дасьледнік Сібіры.
1882	На станцыі Лясная (Баранавіцкі р-н) нарадзіўся Уладыслаў Галубок, беларускі пісьменьнік, рэжысёр, актор, тэатральны дзеяч, мастак.
1909	У в. Бойдаты (Ваўкавыскі р-н) нарадзіўся Язэп Найдзюк (Александровіч), дзеяч заходнебеларускага вызвольнага руху, выдавец, гісторык. Аўтар кнігі "Беларусь учора і сяньня".
1912	У в. Чамяры (Сланімскі р-н) нарадзіўся Анатоль Іверс (сапр. Іван Міско), беларускі паэт.
1916	У в. Запольле (Навагрудзкі р-н) нарадзілася Ніна Тарас, беларуская паэтка.
1930	У в. Вялікая Каўпеніца (Баранавіцкі р-н) нарадзіўся Генадзь Банкевіч, грамадзкі дзеяч, сябра КХП-БНФ "Адраджэньне".
1936	У в. Вялікі Бор (Хойніцкі р-н) нарадзіўся Барыс Сачанка, беларускі пісьменьнік, публіцыст.
1944	У в. Занюкі (Шчучынскі р-н) нарадзіўся Антон Сьцяпура, дзеяч беларускага руху ў Гародні, сябра БНФ.
1950	У Тураве быў адчынены краязнаўчы музей (заснаваны 2.12.1949).
1971	У Лёндане былі адчынены Беларуская бібліятэка і музей імя Францішка Скарыны.
1979	У Менску быў адчынены Музей старажытнабеларускай культуры (заснаваны 7.7.1977).
1981	У Канадзе памёр Тарас Баравец (мянушка Бульба), дзеяч украінскага нацыянальнага руху. Летам 1941 разам з беларускімі групамі вёў змаганне за вызваленне Палесся ад бальшавікоў.
1993	У Гомелі быў створаны Музей-лабараторыя Францішка Скарыны.

Сёння

Слухайце таксама:

Даты тыдня (/peradachy/daty-tydnya/)

Галерэі (/galerei/)

(https://www.racyja.com/kultura/u-vilni-prajshla-noch-muzeyau/) У Вільні прайшла „Ноч музеяў" (https://www.racyja.com/kultura/u-vilni-prajshla-noch-muzeyau/)

(https://www.racyja.com/sumezhzha/anons-peradachy-z-padlyashsha-rodam-ivon-2/) Анонс перадачы „З Падляшша родам": Івона Зінкевіч (https://www.racyja.com/sumezhzha/anons-peradachy-z-padlyashsha-rodam-ivon-2/)

(https://www.racyja.com/sumezhzha/rasejski-tank-u-belastoku-galouny-ant/) Расейскі танк у Беластоку: галоўны антываенны экспанат "Ночы музеяў-2023" (https://www.racyja.com/sumezhzha/rasejski-tank-u-belastoku-galouny-ant/)

больш (/galerei/)

Відэа (/videa/)

(https://www.racyja.com/palityka/zyalenski-i-tsikhanouskaya-patsisnuli-adz/) Зяленскі і Ціханоўская паціснулі адзін аднаму рукі (https://www.racyja.com/palityka/zyalenski-i-tsikhanouskaya-patsisnuli-adz/)

(https://www.racyja.com/sumezhzha/migranty-atakavali-polski-pamezhny-p/) Мігранты атакавалі польскі памежны патруль (https://www.racyja.com/sumezhzha/migranty-atakavali-polski-pamezhny-p/)

больш (/videa/)

Рацыя @ Instagram (https://instagram.com/racyja)

Беларускае Радыё РАЦЫЯ

фінансуецца Міністэрствам замежных спраў Рэспублікі Польшча

(http://www.msz.gov.pl)

(http://solidarityfund.pl/)

(https://polskapomoc.gov.pl)

(https://pl.usembassy.gov/pl/)

15-472 Беласток, вул. Цепла 1/7
тэл. сакратарыята +48 85 676 80 20
fax: +48 85 676 80 25

тэл. для слухачоў +48 85 654 51 51
тэл. для SMS +48 508 667 663
тэл. рэдакцыі +48 85 676 80 24

e-mail: info@racyja.com (mailto:info@racyja.com)
skype: racyja (skype:racyja?chat)

Палітыка (https://www.racyja.com/razdziel/palityka/)
Грамадства (https://www.racyja.com/razdziel/hramadstva/)
Эканоміка (https://www.racyja.com/razdziel/ekanomika/)
Культура (https://www.racyja.com/razdziel/kultura/)
Сумежжа (https://www.racyja.com/razdziel/sumezhzha/)
Спорт (https://www.racyja.com/razdziel/sport/)
Вандроўкі (https://www.racyja.com/razdziel/vandrouki/)
Радыё (/radyyo/)
Сетка вяшчання (/radyyo/setka-vyashchannya/)
Перадачы (/radyyo/peradachy/)
Слухайце нас (/radyyo/slukhajtse-nas/)
Кантакт (/kantakt/)
Падляшскі канцэрт пажаданняў (https://www.racyja.com/padlyashski-kantsert-pazhadannyau/)
Месца для Прэсы (/peradachy/mestsa-dlya-presy/)
Блогі Рацыі (/blohi-racyi/)
Арт-каментар Алега Мініча (https://www.racyja.com/art-kamientar/)
Мабільныя аплікацыі (/apps/)

Партнёры



(https://www.regjeringen.no/en/dep/ud/id833/)



(http://www.nlembassy.pl/)



(https://www.mswia.gov.pl/)



(http://niva.bialystok.pl/)



(http://www.radabnr.org/)



(http://spring96.org/)



(http://palitviazni.info/)



(http://euroradio.fm/)



(http://kamunikat.org/)



(http://vytoki.net/)



(https://malanka.media/)

Nadawcą programu Białoruskie Radio Racja jest spółka Białoruskie Centrum Informacyjne Sp. z o.o. Witryna internetowa nadawcy: www.racyja.com. Wspólnikami spółki są: - Białoruskie Centrum Informacyjne Sp. z o.o. z siedzibą w Białymstoku, - Dzmitry Novikau zamieszkały w Warszawie. Nadawcą kieruje zarząd w składzie: Eugeniusz Wappa – Prezes Zarządu, Piotr Jankowski – Wiceprezes Zarządu, Elżbieta Anna Tyszuk – Prokurent. Beneficjentami rzeczywistymi dla nadawcy są: - Białoruskie Centrum Informacyjne Sp. z o.o. z siedzibą w Białymstoku, - Dzmitry Novikau zamieszkały w Warszawie. Nadawca podlega jurysdykcji Rzeczypospolitej Polskiej. Organem właściwym w sprawach dotyczących radiofonii i telewizji jest Krajowa Rada Radiofonii i Telewizji.

Copyright © 2018 Racyja.com